**В. А. Буднік**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт

# ТЫПАЛОГІЯ ГЕРОЯ Ў АПОВЕСЦІ І. ПТАШНІКАВА "ЛОНВА"

Творчае развіццё І. Пташнікава ў 60-я гг. характарызуецца неабходнасцю ўдакладнення і глыбейшай дыферэнцыяцыі сацыяльна-псіхалагічных вясковых тыпаў на розных гістарычных этапах. Пошук характараў, якія ўвасобілі этычны ідэал пісьменніка – дабрыні, прыгажосці, сумленнасці, нязломнасці перад выпрабаваннямі, – выразнае перакананае сцвярджэнне чалавечых, нацыянальных, маральных каштоўнасцей пачаўся з аповесці "Лонва" (1965).

У аснову сюжэта твора пакладзена жыццё беларускай вёскі ў першыя пасляваенныя гады. Праз цікавыя вобразы, маляўнічыя пейзажы, бытавыя малюнкі і дэталі, арыгінальную сюжэтна-кампазіцыйную структуру мастаку

ўдалося перадаць магутны пульс жыцця, атмасферу клопату і павольнага вяртання жыцця ў мірны, але трывожны 1946 г. У аднолькавай ступені цікавяць мастака справы лясной гаспадаркі і нялёгкі клопат калгаснікаў, сутнасць канфлікту паміж старшынёй калгаса Кастыцкім і лонаўцамі. Сучаснае і мінулае вёскі, трапяткая, нясмелая шчырасць першага пачуцця, светлая мара і суровая рэальнасць, маральныя ўстоі, быт – усё, з чаго складаецца жыццё працоўнага чалавека, служыць аб'ектам мастацкага адлюстравання. Падзеі ў творы не ўражваюць чытача сваёй маштабнасцю ці выключнасцю. Дзень пры дні ходзяць у лес чысціць лініі трактарыст Звішнюк і яго рабочыя – Жэнька, Света, Андрэй Акцызнік і хлопчык-падлетак Юрка Даліна. Менавіта пачынаючы з "Лонвы" І. Пташнікаў стаў паслядоўным мастацкім летапісцам родных мясцін (як вядома, пісьменнік нарадзіўся ў вёсцы Задроздзе раней Плешчаніцкага, а цяпер Лагойскага раёна).

У аналітычным пташнікаўскім стылі характары герояў не змяняюцца, як правіла, не развіваюцца, а як бы паступова напаўняюцца. Кампазіцыя твора пабудавана такім чынам, што пісьменнік ставіць сваіх герояў у абставіны, дзе яны раскрываюцца не столькі праз учынкі, колькі праз свет пачуццяў і думак. Увесь твор напоўнены думкамі галоўных герояў, аналізам іх жыцця, учынкаў, пачуццяў: "Зоркі ў небе, – падумаў ён (Завішнюк – В. Б.). Іх жа там як насыпана… І маленькія, што іскры… Няўжо яны не для нас? Не для нас з табой?.. Скажы мне, не маўчы… Скажы. Нашто мне твая крыўда, нашто? Ты маўчыш, бо крыўдзішся на мяне…" [1, с. 413]. Цікава, што ў творы думкі герояў перадаюцца праз ускосную гаворку саміх персанажаў, а ў некаторых выпадках з думкамі герояў нас знаёміць наратар: "Супакоіўшыся, Звішнюк падумаў, што на мокрым ручніку не відаць слёз… Пасля падумаў, што можна схаваць свае слёзы…" [1, с. 409].

Лонва – гэта цэлы непаўторны свет, свет прыроды і людзей, іх дум і пачуццяў, усяго перажытага аўтарам. Асноўны тон аповесці рамантычна-лірычны. Звязана гэта з асаблівасцю мастацка-наратыўнай структуры твора: падзеі падаюцца праз успрыманне юнака Завішнюка і падлетка Юркі Даліны, зачараваных прыродай, лясамі і хараством. У творы І. Пташнікаў сцвярджае свой галоўны мастацкі прынцып – быць ва ўсім верным жыццю, заўсёды імкнуцца пісаць пра жыццёвыя рэальныя факты, падзеі, сітуацыі, пра людзей, якія жылі і жывуць сёння і жыццё якіх ён добра ведаў. У адлюстраванні рэчаіснасці пісьменнік ішоў ад асабіста ўбачанага, адчутага, і нават істотным момантам з'яўляецца пэўная адпаведнасць узросту герояў узросту аўтара ў тыя гады. Таму аўтарскія эмацыянальныя адносіны натуральна ўліліся ў эмацыянальны свет герояў твора.

"Лонва" – гэта твор пераходны ў жанравых адносінах. Гэта аповесць па структуры нагадвае навелы. Кожная навела – як бы кавалак жыцця таго або іншага героя, у пэўным сэнсе адзіны, цэласны, хоць з моцным адчуваннем вырванасці з жыцця эмацыянальнымі падзеямі. Раздзелы ў "Лонве" існуюць самі па сабе, не маюць выразнай унутранай завершанасці, як гэта ўласціва

жанру навелы. Яны – часткі цэлага. Падзеі, апісаныя ў творы, – адлюстраванне працы Завішнюка, яго каханне да Жэнькі, захапленне прыродай, яго роздум над складанасцю чалавечых лёсаў, над сённяшнім жыццём Лонвы; пранікненне ва ўнутраны свет Юркі Даліны, яго жахлівае мінулае, паказ супярэчлівых характараў Акцызніка і Чаркашына, вобраз Грасільды, жанчыны няпростага лёсу, якая, аднак, не страціла ўлюбёнасць да жыцця і чуласць да людзей. Усе гэтыя мастацкія эскізы, аб'яднаныя адзінствам настрою, адзінствам месца і часу дзеяння, злучаны пэўнымі сюжэтна-кампазіцыйнымі звязкамі.

Падзеі пераважна перадаюцца праз успрыманне аднаго з галоўных герояў – трактарыста Завішнюка ці Юркі Даліны, гэта значыць тых, чыёй падзеяй гэта з'яўляецца. Такі прыём дае магчымасць пісьменніку падаць рэальныя факты ў моцным эмацыянальным асвятленнні, а характары раскрыць знутры, напоўніўшы ўнутраны свет чалавека складаным рэальным жыццём.

Цікавым і прынцыпова важным у творы з'яўляецца вобраз Грасільды. Гэтая гераіня – увасабленне лепшых якасцей народнага характару. Вобраз Грасільды выяўляецца непасрэдна праз яе аповеды і апасродкавана – праз адносіны да яе Завішнюка. Вось, напрыклад, такой бачыць яе Завішнюк: "...твар яе, некалі шырокі і прыгожы, цяпер зусім пастарэў, асунуўся, выступілі скулы – вунь як знаць. Нават пры агні відаць ужо многа маршчын, глыбокіх і непрыгожых. Вочы яе блішчалі, мусіць, ад прыхаваных слёз. Блішчалі ад агню і яе белыя на галаве і ў касе на патыліцы валасы" [1, с. 243]. Для самога пісьменніка тут, у гэтым вобразе, бачыцца прынцыпова важны крок на шляху мастацкага спасціжэння духоўных крыніц народнай жыццядзейнасці і жыццястойкасці. Лёс гераіні – тыповы для беларускай жанчыны з пасляваеннай вёскі. Яна засталася адна, хату ёй скідалі сяк-так талакой. У Лонве ўсім так рабілі. Каб не было селішча, не будавалася б яна, дажывала б, відаць, у каго кутам. Праз думкі, разважанні Завішнюка чытач даведваецца, колькі гора перанесла за вайну гэтая добрая беларуская жанчына. Але асабістае гора, цяжкасці і пакуты, што выпалі на яе долю, не прыглушылі шчырасць і павагу да людзей, дабрыню, спагаду.

Трагічнае водгулле вайны асабліва балюча гучыць у вобразе Юркі Даліны. Вобраз гэты ідэйна, эмацыянальна звязаны з вобразам Грасільды, бо лёс яе сына падобны да лёсу гэтага хлопца. Ён таксама загінуў. Пісьменнік-псіхолаг перадае духоўны, эмацыянальны свет душы падлетка, паказвае непасрэднасць і чысціню яго адносін да людзей, да навакольнага свету. Хлопчык ледзь не загінуў у вайну, але ўжо пасля заканчэння вайны, у 1946 г., Юрка гіне ад выбуху снарада. Стварэнне гэтага вобраза патрабуе ад мастака асаблівага майстэрства, дакладных, мяккіх інтанацый. Выяўляючы ўнутраны свет, гармонію душы, пісьменнік імкнецца да вялікай жыццёвай і мастацкай праўды. Зразумела, што складанасць ваеннага часу і не менш цяжкія і першыя пасляваенныя гады нараджаюць у падлетка роздум.

На працягу ўсяго твора мы можам назіраць яго разважанні, думкі: “Чаму яна (Жэнька – В. Б.) сёння такая ціхая?” – думае Юрка. Ціхая ўсе дні пасля вечарынкі ў Палюхі… Не гаворыць з Завішнюком, нават з імі, Светай і Юркам, і то мала гаворыць” [1, с. 382]. Пісьменнік знайшоў адпаведную манеру пісьма, якая дапамагае ярка намаляваць характар хлапчука. Зразумела, што складанасць ваеннага часу і не менш цяжкія і пасляваенныя гады выклікаюць у падлетка павышаную інтэнсіўнасць думкі: “Юрка думае, што ён вунь як любіць сонца… Успамінае, як у вайну і пасля вайны вясной, калі яшчэ на дварэ ляжаў снег, выбягаў босы да хаты, пад прызбу, грэў на сонцы босыя ногі. А летась увосень бегаў у школу босы, калі ўжо раніцай ад марозу была белая трава на сцежцы і змярзалася ў груду гразь на грэблі” [1, с. 387]. І. Пташнікаву добра ўдаецца спалучыць у вобразе Юркі Даліны дзіцячую непасрэднасць з дачасным пасталеннем. У такім узросце душа падлетка асабліва крыўдлівая, асабліва востра рэагуе на кожнае слова, погляд, нават жэст таго, хто побач з ім. Пастаянна Юрка аналізуе, думае, ацэньвае, сам жа пісьменнік застаецца недзе ўбаку, каб толькі ў цяжкую хвіліну прыйсці на дапамогу свайму герою.

Вобраз Завіншюка ў “Лонве” займае цэнтральнае месца. Пераважная большасць падзей падаецца праз яго ўспрыманне. Эмацыянальная атмасфера Лонвы – атмасфера яго адносін. Пісьменнік уважліва сочыць за яго думкамі і пачуццямі. У жыцці для Завішнюка галоўнае – знайсці мэту, вызначыць асноўную лінію яе дасягнення. Канкрэтны вобраз пачынае набываць нейкае паэтычнае значэнне ўжо ў пачатку твора, калі Завішнюк прыязжае ў Лонву. “Завішнюк ведае мсціжаўскія лясы, яшчэ калі вучыўся ў інстытуце. Прыязджаў сюды, у Мсціжы, пасля вайны на практыку – памочнікам таксатара” [1, с. 253].

Твор глыбока ўзнаўляе рэчаваю рэальнасць навакольнага свету, максімальна набліжае яго да чытача. І дасягаецца гэта высокай канкрэтыкай, увагай да падрабязнасці, дэталі. Асабліва заўважаецца імкненне аўтара перадаць гукі ў тэксце, і адбываецца гэта настолькі ўдала, што складаецца ўражанне, што гэтыя гукі чуеш сам: “Брэша сабака, крычаць на сутонні пастухі, галёкаюць на ўсё горла, як і сто, як і дзвесце гадоў назад у гэтым лясным краі – у Мсціжах” [1, с. 236]; “Зноў гудзе матор, ляскае малатарня… Юрка ўздрыгвае – гэта Смык пабег да гары, і па каменні ляскалі калёсы” [1, с. 283]; “Скрыпяць, трашчаць, енчаць бярозкі – яны цвёрдыя, караватыя” [1, с. 296].

Як бачым, аўтар паказаў звычайнае жыццё людзей, жыхароў пасляваеннай вёскі на сваёй зямлі. І. Пташнікаў перадаў радасны і адначасова трывожны час, у які жылі героі. Гэта надзвычай трагічны твор, бо вайна забірае людскія жыцці. У аповесці Івана Пташнікава “Лонва” перад намі праходзіць жыццё з яго радасцямі і трывогамі, высокімі парываннямі і горкімі расчараваннямі, жыццё, у якім ёсць любоў да роднай зямлі, мара

пра хараство, пра шчасце, светлае і шчырае каханне, у якім ёсць таксама і смерць, чалавечы боль, трывога, грубасць, хцівасць.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Пташнікаў, І. Тартак. Лонва : аповесці / І. Пташнікаў. – Мінск : Беларусь, 1970. – 432 с.